# Культурны код і эканоміка культуры



***25 кастрычніка ў Інстытуце сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбыўся Рэспубліканскі навукова-практычны семінар «Сучасная культура Беларусі: трэнды і выклікі». Праблематыка семінара вельмі актуальная, тым больш, яна адпавядае тэматыцы задання «Даследаванне сацыякультурных механізмаў і фактараў кансалідацыі беларускага грамадства» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016 – 2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».***

Адной з асноўных праблемаў семінара вызначаная эканоміка культуры. Грунтоўныя даклады на гэтую тэму зрабілі загадчык сектара развіцця сацыяльных галін Навуковага інстытута эканамічных даследаванняў Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь Алена Рыбчынская («Удасканаленне механізмаў прыцягнення прыватнага капіталу ў сферу культуры»), доктар сацыялагічных навук, прафесар Анатоль Ляўко («Культура. Інавацыі. Рынак»), старшыня грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя Кліцунова («Выкарыстанне прыёмаў крэатыўнай эканомікі ў сферы агратурызму»). Аўтарамі быў прааналізаваны стан культуры праз прызму эканамічных паказчыкаў, а таксама выяўлены тэндэнцыі выкарыстання інструментаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства і грантавай дапамогі на культурныя праекты.

Фундаментальным было паведамленне акадэміка, доктара філасофскіх навук, прафесара Яўгена Бабосава на тэму «Культурны код нацыі – сістэмаўтваральнае ядро беларускай культуры». Асобна дакладчык звярнуў увагу на праблемы ўшанавання памяці выдатных дзеячаў беларускай культуры. З цікавым дакладам выступіла намеснік дырэктара Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук Ірына Лашук, якая на прыкладзе тэатральнага мастацтва краіны выявіла асаблівасці спажывання на рынку культурных паслугаў. Пытанням жыццёвых і прафесійных каштоўнасцяў маладых спецыялістаў установаў культуры Беларусі быў прысвечаны даклад навуковага супрацоўніка Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Вольгі Ліхачовай. Вольга Мікаласўна правяла грунтоўнае сацыялагічнае даследаванне і стварыла своеасаблівы партрэт супрацоўніка сферы культуры сённяшняга дня.

У працы семінара таксама бралі ўдзел прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Інстытута культуры Беларусі, Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, Цэнтра культуры горада Гродна.

Як адзначылі арганізатары семінара, «на базе Інстытута сацыялогіі плануецца стварэнне прасторы для дыялогу інстытуцыянальных і недзяржаўных суб'ектаў культуры з мэтай пошуку шляхоў павышэння эфектыўнасці дзейнасці ў сферы культуры і пашырэння грамадскага ўдзелу ў гэтых працэсах».

*Павел САПОЦЬКА,*
*фота аўтара*

*На фота: акадэмік Яўген Бабосаў і намеснік дырэктара Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Ірына Лашук*


